Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
аддзел бібліятэчнага маркетынгу

**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за кастрычнік 2015 г.**

## Мерапрыемствы да Дня пажылых людзей

**01 кастрычніка**

Выступленне ЛПГ "Натхненне" з тэматычнай праграмай "Гадамі багатыя - душой маладыя". У мерапрыемствы прынялі ўдзел старшыня прафсаюзнага камітэта ААТ "Гарадзец - агра" Покалюк І.А., старшыня Савета ветэранаў ААТ "Гарадзец - агра" Ляшко І.І. Запрошаныя ўдзельнічалі ў конкурсах на кемлівасць -"Заўзятыя частушэніцы", " А я размаўляю, прагаворваю", адгадвалі загадкі і прымаўкі – "Пра дзядулю і бабулю", чыталі байкі і спявалі частушккі, дзяліліся сакрэтам сваёй маладосці.

*Гарадзецкая СБ, 40 чал.*

**01 кастрычніка**

Выступленне ЛПГ з тэматычнай прграграмай «Мы душой не старэем». У свяце прынялі ўдзел: старшыня Залескага с/с – В.П.Іванюк, настаяцель Свята Петра-Паўлаўскага храма - айцец Аляксандр, старшыня Савета ветэранаў Залескага с/с – Л.М.Рымарук. Падчас свята ўшаноўваліся доўгажыхары, юбіляры, народныя ўмельцы. Арганізавана персанальная выстава вышытых ручнікоў «Рук залатых выдатныя тварэнні» мясцовай жыхаркі Пратасевіч Галіны Рыгораўны.

*Залеская СБ, 50 чал.*

**01 кастрычніка**

Бібліятэчныя пасядзелкі "Сагрэем далоні, разгладзім маршчынкі" праведзены сумесна з Тэвельскім СДК. Старшыня Тэвельскага с/с Кузняцова І.В павіншавала запрошанных. Прысутныя чыталі вершы, байкі, распавядалі пра сакрэты сваёй маладосці, спявалі.

*Тэвельская СБ, 35 чал.*

**01 кастрычніка**

Пасяджэнне клуба «Залатыя гады» на тэму «Пасядзім па-добраму, хай віскі зацярушаны». На працягу вечара гучалі вершы, байкі, выконваліся народныя песні і рамансы ў выкананні ўдзельнікаў клуба «Сустрэча» пад кіраўніцтвам Жуковіч В.А. Гасцям вечара былі прапанаваны жартоўныя гульні і конкурсы. З выкарыстаннем відэароліка «Залатыя гады – 10 гадоў» зроблены экскурс па пасяджэннях клуба «Залатыя гады», які адзначыў сёлета свой 10-летні юбілей.

*ЦБ, 48 чал.*

## Мерапрыемствы да Дня Маці

**13 кастрычніка**

Пасяджэнне клуба «Час і ты» на тэму «Песня матчынага сэрца», якое адбылося ў Кобрынскім дзяржаўным плітэхнічным каледжы. Арганізавана кніжная выстава «Сонца душы маёй», паказана відэапрэзентацыя «Сквозь страны и века звучащий женский голос". Удзельнікі пасяджэння прынялі актыўны ўдзел у віктарыне.

*ЦБ, 26 чал.*

**18 кастрычніка**

Свята "Цяплом тваім зямля сагрэта, мама", арганізавана сумесна з Тэвельскім СДК і Тэвельскім дзіцячым садам-школай. На працягу мерапрыемства пацешалі сваім выступленнем дзеці, гучалі вершы, песні. Не пакінула абыякавымі гледачоў выстава творчых прац "Падарунак маме" і кніжная выстава "Слова пра маці."

*Тэвельская СБ, 40 чал.*

**18 кастрычніка**

Свята"Зазірніце ў маміны вочы" арганізавана сумесна з Балоцкім СДК. У час мерапрыемства выступілі удзельнікі лялечнага гуртка "Церамок" на тэму "Усё светлае ад сонца, усё добрае ад маці"- падарунак усім матулям і бабулям. З вялікім натхненнем дзеці выконвалі песні пра матуль, чыталі прыгожыя вершы. У выкананні Балоцкага народнага хору прагучалі беларускія і рускія народныя песні, якія не пакінулі абыякавымі гледачоў старэйшага пакалення. Прысутныя з цікавасцю пазнаёміліся з кніжнай выставай «Гэта святое слова – мама» і выставай малюнкаў "Таленты роднага краю".

*Балоцкая СБ, 30 чал.*

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**11 кастрычніка**

Дзень краязнаўства "Родны сэрцу горад мой". Удзельнікамі сталі ўсе наведвальнікі бібліятэкі. Мерапрыемства суправаджалася мультыпрэзентацыяй краязнаўчага характару. Гучалі вершы паэтаў кобрыншчыны і песні ў выкананні бардаў.

*ЦБ, 135 чал.*

**22 кастрычніка**

Тэматычная сустрэча з навучэнцамі 3 класа «Спяшайцеся рабіць дабро!». Гутарка ішла з выкарыстаннем матэрыялаў выставы «Дабро, рассыпанае на старонках кніг». Дэвізам сустрэчы сталі словы М.Твэна «Дабро – гэта тое, што можа ўбачыць сляпы і пачуць глухі». Дзеці працавалі са слоўнікамі, шукалі прыказкі, крылатыя выразы, паглядзелі відэаролік «Бумеранг дабра», распавядалі пра свае добрыя справы, якія рабілі спантанна і не чакалі за гэта нейкай падзякі. У завяршэнні дзеці зрабілі добрую справу для бібліятэкі – адрамантавалі старыя кнігі.

*Залеская СБ, 16 чал.*

**23 кастрычніка**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры цэнтральнай бібліятэкі прайшоў трэнінг «Стварэнне электронных прэзентацый у рамках раённага конкурсу «Малады чытач – 2015». Падчас трэнінгу сельскія бібліятэкары Кобрынскай ЦБС падзяліліся вопытам збору матэрыялаў пра самых актыўных маладых чытачоў, паказалі напрацоўкі прэзентацый, вызначыліся з намінантамі раённага конкурсу «Малады чытач – 2015».

*ЦБ, 28 чал.*

## <u>Выдавецкая дзейнасць</u>

**19 кастрычніка**

Супрацоўнікаміі аддзела бібліятэчнага маркетынгу падрыхтаваны каляндар юбілейных і памятных дат у дапамогу планаванню на 2016 год.У каляндар увайшлі знамянальныя даты беларускага календара і пісьменнікаў - юбіляраў, творы - юбіляры беларускіх аўтараў, даты расійскага і замежнага календара, кнігі - юбіляры рускіх і замежных аўтараў, а таксама цікавыя і незвычайныя святы.

*ЦБ*

**19 кастрычніка**

Супрацоўнікамі аддзела бібліятэчнага маркетынгу падрыхтаваны метадычныя рэкамендацыі « Спасти от опасного вируса» ў дапамогу супрацоўнікам бібліятэк. Рэкамендацыі ўтрымоўваюць актуальныя формы і метады працы бібліятэк, назвы тым мерапрыемстваў па прафілактыцы наркаманіі і ўжыванні спайсу.

*ЦБ*

Выканаўца:
Бібліятэкар 1 катэгорыі
Легацюк Л.В.
Тел. 2-36-81